# БУДУЧЫНЯ СТАНОВІЦЦА ЯВАЙ

Яшчэ не так даўно мы гаварылі пра светлую будучыню, камуністычнае заўтра, і не думалі, што ўсё гэта так блізка. У праекце Праграмы Камуністычнай партыі Савецкага Саюза, які пасля ўсенароднага абмеркавання будзе зацверджаны XXII з'ездам КПСС, сказана: **«ПАРТЫЯ ЎРАЧЫСТА АБВЯШЧАЕ: ЦЯПЕРАШНЯЕ ПАКАЛЕННЕ САВЕЦКІХ ЛЮДЗЕЙ БУДЗЕ ЖЫЦЬ ПРЫ КАМУНІЗМЕ!»**

Наш народ ведае, што ўсе планы яго роднай партыі заўсёды станавіліся жывой рэальнасцю. «Шаги саженьи» краіны Саветаў вымяраюцца гіганцкімі маштабамі першых пяцігодак, такімі рэвалюцыйнапераўтваральнымі фактарамі, як сацыялістычная індустрыялізацыя, пераход раздробненай аднаасобнай сельскай гаспадаркі на шлях калектывізацыі, культурная рэвалюцыя і масавы рост новых кадраў. А колькі яркіх, залатых старонак у кнігу славы краіны ўпісалі будаўнікі Магніткі і Днепрабуда, пакарыцелі Паўночнага полюса — чалюскінцы і лётчыкі чкалаўскай плеяды, першыя трактарысты, якія, не палохаючыся кулацкіх абрэзаў, заворвалі межы вузкіх палосак. У слаўных подзвігах герояў Халхін-Гола, удзельнікаў паходу за вызваленне працоўных Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны, а потым у нечуванай па сваёй жорсткасці бітве з крывавым нямецкім фашызмам у гады Вялікай Айчыннай вайны гартавалася зброя нашага народа, які ўмее не толькі будаваць, але і абараняць свае здабыткі, сваю Радзіму ад ворагаў.

Яшчэ ў першыя гады савецкай улады Ленін уважліва сачыў за маладымі парасткамі нашай навукі, ён гаварыў, што з асяроддзя рабочай і сялянскай масы вырастуць здольныя арганізатары вытворчасці і таленавітыя вынаходцы. Ленін радаваўся, калі ў вёсцы загарэліся першыя электрычныя лямпачкі, ён марыў, каб на палях сацыялістычных гаспадарак з'явіліся сотні тысяч трактараў. Уладзімір Ільіч прадбачыў найвялікшыя магчымасці такіх навук, як фізіка, радыётэхніка.

Ажыццяўляючы ленінскія мары і запаветы, савецкі народ за нябачана кароткі гістарычны тэрмін стварыў такую навуку і тэхніку, якія па многіх галінах далёка пераўзышлі навуку і тэхніку капіталістычных краін. Атамныя ледаколы і электрастанцыі, спадарожнікі зямлі і электронна-вылічальныя машыны, балістычныя ракеты — усё гэта вялікі трыумф творчай думкі савецкага чалавека.

Ленін гаварыў, што самай вялікай перамогай савецкага народа з'яўляецца яго перамога над розумамі людзей свету. «Наша сацыялістычная рэспубліка Саветаў,— пісаў Ленін,— будзе стаяць моцна, як факел міжнароднага сацыялізма і як прыклад перад усімі працоўнымі масамі».

Аб сіле гэтых ленінскіх прадбачанняў лепш за ўсё сведчаць поспехі

сусветнай сацыялістычнай сістэмы. Камунізм, які ўладарна крочыць па зямлі, паказвае чалавецтву шлях да сапраўднай свабоды і шчасця працоўных. Народы капіталістычных краін ясна бачаць, што стваральнікі матэрыяльных багаццяў — рабочы і селянін — могуць жыць і быць гаспадарамі свайго лёсу, без памешчыкаў і капіталістаў, без войнаў і ашуканстваў, без нястач. Калі простыя людзі свету з усёй палымянасцю сваіх сэрцаў вітаюць новую велічную праграму працы і барацьбы нашай партыі і народа, то завадатары капіталізму намагаюцца з усяе сілы, каб у паклёпе і брудзе патапіць праўду аб нашай краіне. Гаспадары жоўтага д'ябла, амерыканскія мільярдэры і іх найміты, хочуць развязаць новую сусветную вайну. У ёй бачаць імперыялісты выратаванне сваёй струхлелай, асуджанай на пагібель сістэмы. Савецкі народ і працоўныя краін сацыялістычнай садружнасці пільна стаяць на варце міру. Праграма КПСС гаворыць усяму свету, што вайны можна пазбегнуць, што ўсе самыя складаныя пытанні міжнароднага жыцця можна вырашыць шляхам перагавораў, мірным шляхам.

Але ў той жа час партыя і ўрад прымаюць усе неабходныя меры, каб умацоўваць абаронную магутнасць краіны, каб яна заўсёды была гатова даць належны адпор любому агрэсару.

Дзве часткі Праграмы суадпаведна даюць найглыбейшы аналіз мінулага і будучага дзвюх сістэм — капіталістычнай і сацыялістычнай.

«Камунізм — светлая будучыня ўсяго чалавецтва»,— такімі аптымістычнымі словамі пачынаецца частка Праграмы, дзе выкладаюцца задачы партыі і народа па будаўніцтву камуністычнага грамадства.

За кожным радком, за кожнай лічбай гэтага раздзела ўстаюць цудоўныя абрысы той велічнай эпапеі, якую наш народ агнём сваіх сэрцаў створыць за наступнае дваццацігоддзе.

Матэрыяльна-тэхнічная база камунізма... Цяпер кожны рабочы, кожны калгаснік, інтэлігент ведае, што яна перш за ўсё ўвасабляецца ў абсталяваных па апошняму слову тэхнікі заводах, фабрыках, аўтаматычных лініях, што гэта самы рашаючы і дзейсны фактар у ліквідацыі адрознення паміж працай фізічнай і разумовай. Гэта — высокія ўраджаі на калгасных нівах, шчодрае багацце ўсіх прадуктаў.

«Велічны будынак камунізма ўзводзіцца ўпорнай працай савецкага народа — рабочага класа, сялянства, інтэлігенцыі. Чым больш паспяховая іх праца, тым бліжэй ажыццяўленне вялікай мэты — пабудовы камуністычнага грамадства».

Гэтыя кароткія словы Праграмы кажуць кожнаму савецкаму чалавеку: дзе б ты ні працаваў, на якім бы ўчастку прамысловасці, сельскай гаспадаркі ці культуры ні знаходзіўся, ведай, што кожны твой новы поспех і поспех твайго калектыву — гэта новая ступенька на шляху магутнага руху нашага грамадства да камунізма.

І савецкія людзі сустракаюць XXII з'езд Камуністычнай партыі новымі выдатнымі падарункамі. Заводы і фабрыкі даюць звышпланавую прадукцыю, з калгасных палёў у засекі Радзімы ідуць новыя і новыя эшалоны з залацістым збожжам.

Разам з усім савецкім народам за дастойную сустрэчу з'езду актыўна спаборнічаюць працоўныя сталіцы рэспублікі і Мінскай вобласці. На нашых прамысловых прадпрыемствах звыш 150 тысяч чалавек змагаюцца за званне калектываў і ўдарнікаў камуністычнай працы. Шырока падхоплена пачынанне Валянціны Гаганавай. На Мінскім тонкасуконным камбінаце гэтае пачынанне падтрымалі 29 ткачых і прадзільшчыц. Майстар абутковай фабрыкі імя Калініна Тацяна Казак летась перайшла працаваць на адстаючы ўчастак і вывела яго ў

перадавыя. Брыгадзір ткацкага цэха камвольнага камбіната камуніст Расказаў двойчы пераходзіў у адстаючыя брыгады і вывеў іх у перадавыя.

Шырока распаўсюджваецца пачынанне Героя Сацыялістычнай Працы расточніка завода аўтаматычных ліній тав. Віташкевіча і шліфоўшчыка падшыпнікавага завода тав. Алексяевіча, якія адмовіліся ад паслуг наладчыкаў і перайшлі на поўнае самастойнае абслугоўванне сваіх станкоў. Іх прыклад перанялі ўжо больш за 5 тысяч рабочых нашай вобласці.

Майстар трактарнага завода тав. Сукала прапанаваў адмовіцца ад кантралёраў і перайсці на самакантроль. 40 рабочых яго ўчастка горача падтрымалі гэтае пачынанне. Калектыў дамогся ўжо адчувальных вынікаў, даючы прадукцыю толькі выдатнай і добрай якасці.

Пачынанне тав. Сукалы падхоплена і на іншых прадпрыемствах горада. Калектывы абутковых фабрык імя Тэльмана і імя Калініна адмовіліся ад аперацыйных кантралёраў і перайшлі на грамадскі самакантроль. А на фабрыцы імя Калініна вызвалена 184 кантралёры.

Вялікі ўклад у справу ўдасканальвання тэхнікі ўносяць рацыяналізатары і вынаходцы. Цікава, што кожны шосты рабочы прамысловасці падаў рацыяналізатарскую прапанову. Эканамічны эфект ад укаранення рацыяналізатарскіх прапаноў за апошнія паўтара года склаў 17 мільёнаў рублёў.

ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

З поўным тэкстам дакумента можна азнаёміцца ў будынку бібліятэкі